## Спорт-тайм

# БАРАЦЬБА ЗА «ЧЫСТЫХ»

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра лёс беларускай зборнай па веславанні на байдарках і каноэ, выступленне моладзі на чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы і склад баскетбольнай зборнай, якая ўжо адправілася на Алімпійскія гульні ў Рыа.**

***1. Міжнародны спартыўны арбітражны суд у Лазане пакінуў у сіле рашэнне Міжнароднай федэрацыі каноэ аб дыскваліфікацыі на год мужчынскай зборнай нашай краіны.***

*— Гэтае рашэнне сама меней абсурднае, — адзначыў* ***міністр спорту і турызму Беларусі Аляксандр ШАМКО****. — Яно выклікае абурэнне. У любым выпадку мы будзем працягваць змагацца за гонар і правы нашых спартсменаў. Для дыскваліфікацыі мужчынскай каманды няма ніякіх падстаў. Няма абгрунтаваных прэтэнзій ні з боку Сусветнага антыдопінгавага агенцтва, ні з боку судовых органаў Францыі. Я перакананы ў праваце і чысціні нашых атлетаў, якія заслужылі права выступіць на летніх Гульнях, — дадаў міністр.*

Беларускі бок шкадуе аб вынесеным рашэнні, але працягне барацьбу за правы сваіх «чыстых» атлетаў у Міжнародным спартыўным арбітражным судзе. Па выніках разгляду гэтай спрэчкі беларускі бок не выключае далейшых дзеянняў на прававым полі ў дачыненні да Міжнароднай федэрацыі каноэ ў рамках грамадзянскага працэсу ў швейцарскіх судах.



***2. Тры ўзнагароды заваявалі беларусы на маладзёжным чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы, які завяршыўся ў польскім Быдгашчы.*** Залаты медаль у бегу на 100 м з бар'ерамі заваявала Эльвіра Герман, сярэбраную ўзнагароду выйграў дзесяціборац Максім Андралойць. На другую прыступку п'едэстала падняўся і кідальнік дыска Глеб Жук.

У агульным медальным заліку зборная Беларусі заняла 12-е месца.

***3. Аляксандр Глеб вярнуўся ў склад барысаўскага БАТЭ.*** 35-гадовы паўабаронца падпісаў кантракт і дапаможа камандзе ў кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў. Нагадаем, Аляксандр дэбютаваў у складзе барысаўчан у 1999-2000 гадах, пасля чаго перайшоў у клуб нямецкай бундэслігі «Штутгарт». У 2005 годзе ён перабраўся ў англійскі «Арсенал», адкуль у 2008 годзе — у іспанскую «Барселону». Таксама Глеб паспеў пагуляць у англійскім «Бірмінгеме», нямецкім «Вольфсбургу», расійскіх «Крылах Саветаў», турэцкіх клубах «Каньяспор» і «Генчлербірлігі». У 2012-2013 і 2015 гадах зноў абараняў колеры БАТЭ.

***4. Айчынная федэрацыя хакея падасць заяўку на правядзенне ў Мінску ў 2021 годзе чэмпіянату свету.*** Такое рашэнне было прынята на пасяджэнні выканкама асацыяцыі.

— Істотным адрозненнем пры падрыхтоўцы падачы заяўкі да турніру з'яўляецца той факт, што ўся неабходная інфраструктура для правядзення планетарнага форуму ў Мінску ўжо ёсць, а папярэдні чэмпіянат свету замацаваў за Беларуссю імідж па-сапраўднаму хакейнай краіны, здольнай бездакорна арганізоўваць і праводзіць турніры самага высокага ўзроўню, — расказалі ў федэрацыі.

Там таксама адзначылі, што кіраўніцтва ФХБ разумее, што з першай спробы дамагчыся мэты будзе складана, таму што ў ліку прэтэндэнтаў на званне краіны — гаспадыні чэмпіянату свету значыцца і Фінляндыя.

***5. Учора жаночая нацыянальная зборная па баскетболе адправілася ў Бразілію.*** Галоўны трэнер Анатоль Буяльскі плануе ўключыць у афіцыйную заяўку 12 баскетбалістак:

**абаронцы** — Аляксандра Тарасава, Вольга Зюзькова, Таццяна Ліхтаровіч, Ліндсэй Хардзінг;

**форварды** — Кацярына Сныціна, Юлія Рыцікава, Таццяна Троіна, Наталля Трафімава, Марыя Філончык, Марыя Папова;

**цэнтравыя** — Настасся Верамеенка, Алена Леўчанка.

Такі ранні выезд абумоўлены неабходнасцю акліматызавацца ў нязвыклым для беларусаў клімаце Бразіліі.

Нагадаем, зборная Беларусі другі раз прабілася на Алімпійскія гульні. На папярэднім этапе нашы дзяўчаты згуляюць у групе А супраць каманд Японіі (6 жніўня), Францыі (7 жніўня), Бразіліі (9 жніўня), Турцыі (11 жніўня) і Аўстраліі (13 жніўня ).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**
*lobazhevich@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.14 | 21.17 | 16.03 |
| Віцебск — | 4.57 | 21.13 | 16.16 |
| Магілёў — | 5.04 | 21.08 | 16.04 |
| Гомель — | 5.08 | 20.57 | 15.49 |
| Гродна — | 5.30 | 21.32 | 16.02 |
| Брэст — | 5.38 | 21.25 | 15.47 |

## Месяц

*Поўня 20.07—26.07.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

***Пр.*** *Антона, Івана, Сцяпана, Юльяна.*
***К.*** *Ганны, Міраславы, Лаўрэнцыі.*



Фота Аляксандра АСІПЕНКІ.

# ЗАЎТРА




## Факт

# Другая маладосць цэнтра культуры

**Год культуры ў аграгарадку Путрышкі Гродзенскага раёна адзначылі вельмі важнай для мясцовых жыхароў падзеяй. Будынак цэнтра культуры, якому ўжо 58 гадоў, адрэстаўраваны і цяпер быццам перажывае другую маладосць.**

— На рэстаўрацыю затрачана 20 мільярдаў рублёў, але гэтыя грошы ўжо акупляюцца, прыносяць карысць людзям, — зазначыў **старшыня Гродзенскага райвыканкама Ян ВАСІЛЕЎСКІ**. — Бо мы ўклалі іх не ў сцены, не ў бетон, а ў будучыню — нашу і нашых дзяцей. У Путрышках і навакольных вёсках шмат талентаў, і я ўпэўнены, што з цэнтра культуры выйдзе нямала «зорачак» — юных спевакоў, танцораў і музыкантаў.

Акрамя цэнтра культуры, у абноўленым будынку размясціліся бібліятэка, дзіцячая музычная школа мастацтваў, адно з памяшканняў прызначана для рэгістрацыі вяселляў. Сцены дыскатэчнай залы і фае ўпрыгожаны мастацкім роспісам, а тэрыторыя вакол будынка — кветкавымі кампазіцыямі ў выглядзе музычных інструментаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

## Даты Падзеі Людзі

### 26 ЛІПЕНЯ

**1831** год — 185 гадоў таму нарадзіўся Ілья Мікалаевіч Ульянаў, рускі педагог-дэмакрат, арганізатар народнай адукацыі ў Сімбірскай губерні, бацька У.І. Леніна. Увёў новыя метады выкладання рускай мовы і арыфметыкі, спрыяў шырокаму прымяненню нагляднасці ў навучанні. Быў працаўнікам цялесных пакаранняў дзяцей і патрабаваў гуманнага абыходжання з навучэнцамі. Клапаціўся пра адукацыю дзяцей нярускай нацыянальнасці (татараў, чувашоў і мардвы), якія пражывалі на тэрыторыі Сімбірскай губерні, для навучання якіх ён адкрыў шэраг свецкіх пачатковых навучальных устаноў.

**1856** год — 160 гадоў таму нарадзіўся Джордж Бернард Шоў, ірландскі драматург і пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1925). Аўтар п'ес «Цэзар і Клеапатра», «Пігмаліён», раманаў «Неразумны шлюб», «Каханне артыста» і іншых.



**1875** год — нарадзіўся Марцін Кухта, друкар, выдавец кніг на беларускай мове. У 1906 г. заснаваў у Вільні друкарню з правам друкаваць кнігі на ўсіх еўрапейскіх мовах. Адным з першых пачаў легальна друкаваць творы Багушэвіча, Багдановіча, Купалы, Коласа, Цёткі, у тым ліку і забароненыя царскай цэнзурай. Выдаваў этнаграфічныя матэрыялы, літаратурныя альманахі, календары, а таксама беларускія песні з нотамі. Дзякуючы друкаванаму станку выдаўца выходзілі ў свет газеты «Наша доля» і «Наша ніва». Памёр у 1914 годзе.

**1945** год — у Патсдаме ад імя ўрадаў Вялікабрытаніі, ЗША і Кітая была апублікавана дэкларацыя, якая патрабавала безумоўнай капітуляцыі Японіі ў Другой сусветнай вайне і змяшчала асноўныя прынцыпы мірнага ўрэгулявання. Пасля адхілення (28 ліпеня) гэтых патрабаванняў японскім урадам 8 жніўня да дэкларацыі далучыўся СССР і абвясціў Японіі вайну. 14 жніўня Японія прыняла ўмовы дэкларацыі. 2 верасня 1945 г. быў падпісаны акт аб капітуляцыі Японіі.

**1953** год — група ўзброеных людзей на чале з Фідэлем Кастра паспрабавала захапіць вайсковыя казармы ў крэпасці Манкада ў горадзе Сант'яга-дэ-Куба. Аднак рэвалюцыянеры пацярпелі паражэнне. Большасць паўстанцаў былі арыштаваны. Суд прысудзіў Кастра да 15 гадоў турэмнага зняволення, аднак у маі 1955-га пад ціскам грамадскасці ён быў амніставаны і высланы за межы Кубы. Тым не менш Кастра не пакінуў надзеі звергнуць дыктатара Батысту. У ЗША і Мексіцы яму ўдалося арганізаваць «Рух 26 ліпеня». Рэвалюцыянеры сталі актыўна рыхтавацца да ўзброенага перавароту.

### Было сказана

**Янка КУПАЛА, народны паэт Беларусі:**
*«Слоў не крышыць ні век, ні тапор».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Карцінкі рэчаіснасці.**
**Дурні ловяць сваімі смартфонамі пакемонаў, зладзеі ловяць дурняў са смартфонамі, міліцыя — зладзеяў з украдзенымі смартфонамі.**
**Усе пры справе.**

Дыялогі ў сецыве.
— А ты прыгожая. Давай сустрэнемся.
— Не магу, я толькі ў інтэрнэце прыгожая.

**Вечарам забыўся зачыніць акно. У выніку ноч ператварылася ў спецаперацыю па знішчэнні камароў. Вынік аперацыі: дваццаць забітых, трое параненых, у тым ліку адзін цывільны — у цемры на ката наступіў.**

— Чым адрозніваецца вясёлы байкер ад сумнага?
— У вясёлага байкера зубы ў мошках!

**Худзенькіх дзяўчат у прагнозе надвор'я цікавіць звычайна не тэмпература паветра, а хуткасць ветру.**

У зоамагазіне. Дама працягвае палец папугаю:
— Ну, зялёненькі, ты размаўляеш?
Папугай:
— Мадам, адкрытасць за адкрытасць: вы якіх несяце?



Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

Наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе 28 ліпеня г.г.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2903.
Нумар падпісаны ў 19.30 25 ліпеня 2016 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12